**Е. З. Рымкевіч,**
настаўнік-дэфектолаг

# Моўнае свята «Лес цудаў»

**Мэта:** замацаванне дакладнага вымаўлення вывучаных гукаў.
**Задачы:**

- пашыраць уяўленні аб гуках і іх лексічнай ролі ў словах;
- фарміраваць уменне нарошчваць маўленчы выдых на гукаперайманнях;
- развіваць інтанацыйную выразнасць мовы, фанематычны слых, пачуццё рытму, каардынацыю рухаў.

**Матэрыял і абсталяванне:** касцюмы ільва, тыграняці, рысяняці, ваўка; канверты і шышкі з лічбамі, сімвалы гукаў, матэрыяоы артыкуляцыйнай гімнастыкі ў малюнках, карцінкі мухамораў і баравікоў, чайны набор, декарацыі па тэме, гульня «Накармі птушаня».

## Ход свята

**Настаўнік-дэфектолаг.** Добры дзень дзеці і бацькі, госці! Вы любіце цуды? Тады я запрашаю вас у лес цудаў. Вочкі зачыняюцца – цуды пачынаюцца (*«Лясныя звяры» займаюць свае месцы ў лясной школе.*) Аднойчы ў лесе я пачуларазмову двух звяроў.
**Рысяня.** Ты хто?
**Тыграня.** Тыграня. А ты?
**Рысяня.** ... Ысяня.
**Тыграня.** Хто-хто?
**Рысяня.** ... Ысяня.
**Тыграня.** А мама ў цябехто?
**Рысяня**. ... Ысь.
**Тыграня.** А тата?
**Рысяня.** ... Ысь.
**Тыграня.** Нічога не разумею!
**Рысяня.** Чаму?
**Тыграня.** Дытаму, штоняматакогазвера.
**Рысяня.** Як няма? А я?
**Тыграня.** Нутады ты няправільнакажаш! Якісьці гук не вымаўляеш!
**Настаўнік-дэфектолаг.** Дзеці, які гук не вымаўляе рысяня? (*Гук [р].*)
**Тыграня.** Язнаю, штотрэбарабіць!
**Рысяня.** Што?
**Тыграня.** Трэба пайсці ў лясную школу да цара звяроў – ільва. Там хутканавучышсяўсегуківымаўляць.
*Тыграня бярэ за лапу рысяня і вядзе ў лясную школу.*
**Тыграня.**Добры дзень.
**Леў.** Добры дзень.
**Тыграня.** Тут вучацьгук [р] вымаўляць?
**Леў.** Тут. Заходзьце. Сядайце. Дзеці, назавіцезвяроў, якіяўмеюцьрыкаць. (*Ільвы, тыгры, леапарды, пантэры, мядзведзі.*). Пагуляем

у гульню «Звяры». Станьце ў круг, уявіце, што вы звяры, зачыніцесваімілапкамі мыскі.

Нестукайце ў гэтыядзверы,
Спяць ўжо, напэўна, зверы!
Калі будзеце пальцамі тыкаць
звярымогуць рыкаць! (Р-р-р-р ...!)

*«Леў" стаіць у цэнтры і лёгенька пастуквае па лапках звяркоў. Пасля слова «рыкаць» дзеці дружна выглядаюць са сваіх хованак і рыкаюць.*

**Настаўнік-дэфектолаг.** Давайцеяшчэпагуляем. Ціўмееце вы слухаць і пазнавацьгаласыдарослых і дзяцей?

Да нас варона ў агарод
Прыляцела і спявае, сеўшы на плот.
А ты, Жэня, не чакай,
Хто варона, называй.

*Выклiканае дзіця адварочваецца, дэфектолаг ківае на таго, хто з дарослых будзе воронай, і той падае голас «Кар».*

- А цяпер пазнай каго-небудзь з дзяцей.

*Дэфектолаг падае сігнал дзіцяці і той крычыць: «Кар!». Калі вядучы адгадае правільна, то новым вядучым становіцца пазнаны. Гульня працягваецца.*

**Тыграня.** Ну што, рыкаць яшчэ не навучыўся?

**Рысяня.** Нееее-ее.

**Тыграня.** Не бяда. Гэта не проста!

**Рысяня.** А як жабыць?

**Тыграня.** Мы з табой на заняткі кожны дзень хадзіць будзем. Паступова навучышся.

**Настаўнік-дэфектолаг.** Так, Тыграня! Усяму можна навучыцца. Пагуляем у гульню «Тэлеграфісты». Падзелімся на дзве каманды. Капітанам каманды дзяцей будзе Жэня, а каманды бацькоў – тыграня.

*Абедзве каманды становяцца ў дзве шарэнгі. Дэфектолаг шэптам прагаворвае чыстагаворкі капітанам, тыя – шэптам перадаюць іх далей. Апошні вымаўляе іх гучна.*

*Шышкі на сасне, шашкі на стале.*
*Машы Саша, Сашы Маша*
*Штосьці смешнае раскажа.*

У нашым лесе ёсць шмат птушак, а ў іх – птушаняты. І зараз пагуляем у гульню «Накармі птушаня». Мы падзелімся на дзве каманды. Адна будзе выбіраць карцінкі з гукам [р] і «карміць птушаня» чырвонымі каўпачкамі, другая – з гукам [л] і «карміць птушаня» жоўтымі каўпачкамі. Мамы выбіраюць карцінкі, дзеці іх правільна называюць і «кормяць птушаня». Выйгрывае той, хто хутчэй накорміць птушаня.

**Настаўнік-дэфектолаг.** Паглядзіце, якая цудоўная елка расце ў нашым чароўным лесе. На ёй прыгожыя шышкі.

Шышку з ялінкі зрывай
Нумарочак атрымай.

*На шышцы – нумар канверта, у якім заданні для мам і іх дзяцей. Для мам – матэрыялы артыкуляцыйнай гімнастыкі ў малюнках, для дзяцей – сімвалы зычных гукаў.*
**Настаўнік-дэфектолаг.** А што ў нас расце пад елкай?
**Дзеці.** Грыбы.
**Настаўнік-дэфектолаг.** А якія гэта грыбы?
**Дзеці.** Мухаморы і баравікі.
**Музычны кіраўнік.** За грыбамі мы сабраліся,
Але ў грыбах не разбіраліся.
Штосабе мы збяром?
Што для ваўка запасём?
Гэта нам ніхто не скажа,
Толькі музыка падкажа.
*Пад гучную музыку дзеці збіраюць баравікі для сябе, пад ціхую мухаморы – для ваўка.*
**Настаўнік-дэфектолаг.** «Воўчыя» грыбы пакінем у лесе для ваўка, а ядомыя складзём ў кошык і пойдзем па сцяжынцы дадому.
**Музычны кіраўнік.** Па вузенькай сцяжынцы ідзём, ідзём, ідзём.
Нясем грыбы ў кошыку і песенку пяём.
*Дзеці ідуць па крузе адно за адным, співаючы і робячы на кожную рытмічную адзінку адзін крок пад музыку польскай народнай песні «Два каты».*
**Воўк.** Ах, так, мухаморы для ваўка. Вось я вам (*дзьме на сабраныя мухаморы і дзеці засынаюць, воўк накідвае на іх сетку*).
Каб вызваленыя былі вашы дзеткі,
Каб выбраліся яны з сеткі,
Каб не ведалі яны мукі
Раскажыце, мамы, чыстагаворкі на іх гукі.
Мамы расказваюць чыстагаворкі на гукі сваіх дзяцей і воўк іх вызваляе.
**Музычны кіраўнік.** Паспяшайся сюды леў-цар. Звяры табе будуць свае песні співаць.
Вожык: ўдых - фы-фы; ўдых - фы-фы-фы (2р.). Лісічкі ўдых - цяў-цяў; ўдых - цяў-цяў-цяў (2р.). Мышкі: ўдых - пі-пі; ўдых - пі-пі-пі (2р.). *(На кожную ролю дзеці співаюць.)*
**Леў.** Малайцы. Песенкі прыгожа співаеце. А ці ўмееце вы расказваць вершы? (*Дзеці расказваюць вершы на свае гукі.*)
**Настаўнік-дэфектолаг.** Глядзіце, рысяня і тыграня прагаладаліся і арганізавалі чаяванне.
**Рысяня.** Ой, які гарачы чай!
**Тыграня.** Як ты сказаў, рысяня? Паўтары.
**Рысяня.** Гар-рачы чай. А што?
**Тыграня.** Ты навучыўся вымаўляць гук [р]?
**Рысяня.** Не ве-да-ю...
**Тыграня.** Ну, вядома, навучыўся! Скажы: сябар.
**Рысяня.** Сябар.

**Тыграня.** Рамонак.
**Рысяня.** Рамонак.
**Тыграня.** Ура!
**Рысяня.** Ура!
**Настаўнік-дэфектолаг.** Дзеці, вы таксама малайцы. Навучыліся самі прыгожа вымаўляць гукі і рысяня навучылі.
(*Дзеці спяваюць песеньку аб гуках на матыў «Песні пра маманцёнка».*)
Калі ў дзіцячы сад мы ўсе прыйшлі,
То многія гукі сказаць не маглі, свісцець і шыпець не ўмелі,
рыкаць і жужжаць не хацелі.
Але лагапед на дапамогу нам прыйшла і многія гукі сказаць памагла.
Цяпер гаворым мы прыгожа,
Яна заўсёды дапаможа.
Мы ведаем, што шмат ёсць гукаў на свеце: шэпты дрэў і плёскат хваль
Бываюць і гукі мовы – мы ведаем іх без вымовы. Ссссс, ззззз, шшшшш, жжжжж, ллллл, ррррр. Цяпер гаварыць мы ўмеем.
**Тыграня і Рысяня.** Дзякуй вам, дзеці. А на развітанне прыміце ад нас падарункі чароўнага лесу.

**Літаратура**


1. Бабина, Е. С. Партнерство ДОУ и семьи в логопедической работе Е. С. Бабина // Логопед. – 2005. – №5.
2. Работа с родителями: пособие для учителей начальных классов общеобразовательных учреждений / М. П. Осипова [и др.]; под ред. М. П. Осиповой. – Минск: Экоперспектива, 2003.
3. Сизоненко, Н. Ф. Организация воспитательной и коррекционной работы в группах детей с нарушениями речи: пособие для воспитателей и учителей-дефектологов дошкольных учреждений / Н. Ф. Сизоненко. – Мозырь: Белый Ветер, 2004.
4. Щедрова, Е. А. Взаимодействие логопеда и семьи по развитию речи / Е. А. Щедрова // Логопедия. – 2004. – №4(6).